На стымульна-прадуктыўным узроўні працуе большасць студэнтаў, дакладней, прывыкла працаваць у такім рэжыме ў школе, тэхнікуме – для ацэнкі, для прамежкавага выніку.

Як паказалі многія даследаванні па метаду крэатыўнага поля, на творчы ўзровень выходзяць 10–15 % падвыпрабавальных. Гэты вынік з'яўляецца пастаянным для студэнтаў усіх ВНУ, у тым ліку для студэнтаў музычных спецыялізацый Мінскага інстытута культуры. На жаль, наша сістэма навучання не садзейнічае развіццю інтэлектуальнай актыўнасці высокага ўзроўню. Магчыма, ва ўмовах адміністрацыйна-каманднай сістэмы патрэбны былі людзі, якія павінны не думаць, а выконваць. Менавіта таму перабудова навучання ў ВНУ, яе дэмакратызацыя і гуманітарызацыя, гуманізацыя і індывідуалізацыя, вывядзенне студэнта на першы план як суб'екта дзейнасці вельмі неабходныя.

Выкарыстанне ў ВНУ новых дыягнастычных методык дазволіць вызначаць зыходны ўзровень інтэлектуальнай актыўнасці і, значыць, больш дакладна прагназіраваць шлях развіцця студэнта, прымяняць методыкі навучання, адэкватныя індывідуальнасці кожнага. Недалёка той час, калі метады дыягностыкі творчых здольнасцей зоймуць дастойнае месца ў адборы абітурыентаў у навучальныя ўстановы.

В.Е. ЛЯВОНЧЫКАЎ, д-р пед. навук (МІК)

## АСНОЎНЫЯ НАПРАМКІ ЎДАСКАНАЛЬВАННЯ ВЫШЭЙШАЙ БІБЛІЯТЭЧНАЙ АДУКАЦЫІ Ў РЭСПУБЛІЦЫ БЕЛАРУСЬ

Вышэйшай бібліятэчнай адукацыі ў рэспубліцы скора споўніцца шэсцьдзесят гадоў. Упершыню бібліятэчнае аддзяленне было створана ў 1933 г. пры Магілёўскім палітыка-асветным інстытуце, з кастрычніка 1944 па чэрвень 1975 г. бібліятэчны факультэт функцыяніраваў пры Мінскім дзяржаўным педагагічным інстытуце імя А.М. Горкага, са жніўня 1975 г.– пры Мінскім інстытуце культуры.

Спачатку падрыхтоўка бібліятэчных кадраў вышэйшай кваліфікацыі была недыферэнцыраванай (універсальнай) і разлічвалася, галоўным чынам, на масавыя бібліятэкі. У 60-я гг. уводзяцца спецыялізацыі па тыпах бібліятэк: універсальныя навуковыя і масавыя, тэхнічныя, дзіцячыя і школьныя. З сярэдзіны 70-х гг. факультэт бібліятэказнаўства і бібліяграфіі пачынае падрыхтоўку бібліятэкараў-бібліёграфаў шырокага профілю са спецыялізацыямі па галіновых комплексах літаратуры: грамадска-палітычнай, тэхнічнай, сельскагаспадарчай, мастацкай літаратуры і мастацтву. З 1987 г. уведзена функцыянальная спецыялізацыя – аўтаматызацыя і механізацыя бібліятэчных працэсаў, а з 1989 г. замест спецыялізацыі бібліятэказнаўства і бібліяграфія грамадска-палітычнай, сельскагаспадарчай, мастацкай літаратуры і мастацтва зноў адкрыта спецыялізацыя – „Масавыя бібліятэкі".

7 Зак. 5399



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Нягледзячы на сталы ўзрост вышэйшай бібліятэчнай адукацыі ў рэспубліцы, на сённяшні дзень у падрыхтоўцы бібліятэкараў патрэбна шмат чаго змяніць ці ўдасканаліць.

Сістэмна-дзейсны падыход да навучання дазваляе разглядаць яго як своеасаблівую дыдактычную сістэму, якая ўключае наступныя кампаненты: мэту, змест, метады навучання; дзейнасць студэнта, выкладчыка; вынік. Дзейнасць выкладчыка і студэнта, а таксама змест навучання з'яўляюцца галоўнымі кампанентамі, якія аб'ядноўваюць усю сістэму ў адно цэлае.

Для актывізацыі навучальна-пазнавальнай дзейнасці студэнтаў выкладчыкам патрэбна пераходзіць галоўным чынам да праблемнага навучання, пад якім разумеецца сістэма спосабаў навучання, забяспечваючых мэтанакіраваную дзейнасць па арганізацыі ўключэння механізмаў мыслення і паводзін студэнтаў шляхам стварэння праблемных сітуацый. Такое навучанне адрозніваецца ад традыцыйнага інфармацыйна-перадатачнага тым, што выкладчык не перадае гатовыя веды, а ставіць перад студэнтамі праблему і выклікае ў іх жаданне знайсці сродкі для яе вырашэння. Пры гэтым маецца на ўвазе характар перадачы (ізлажэння) вядомай навучальнай інфармацыі, але не выключаецца пастаноўка і абмеркаванне пытанняў зусім не распрацаваных навукай ці не здзейсненых у практычнай дзейнасці (апошняе павінна прысутнічаць у праблемным выкладанні).

У сувязі з тым што тэорыю і методыку праблемнага навучання пачалі актыўна развіваць у нашай краіне толькі ў 70-я гг., будзе карысным коратка разгледзець яго патрабаванні. Праблемнае навучанне ажыццяўляецца з дапамогай наступных форм: а) праблемнае ізлажэнне выкладчыкам той ці іншай тэмы лекцыі (так званыя праблемныя лекцыі); б) часткова-пошукавая дзейнасць студэнтаў пры ўдзеле выкладчыка ў час правядзення семінарскіх, практычных і лабараторных заняткаў; в) самастойнае даследаванне і рашэнне праблемнай сітуацыі ажыццяўляецца студэнтамі пад кіраўніцтвам выкладчыкаў пры напісанні рэфератаў, курсавых работ, а таксама пры правядзенні студэнтамі навукова-доследнай працы ў навуковых гутарках ці праблемна-пошукавых групах.

Ключавым паняццем праблемнага навучання з'яўляецца праблемная сітуацыя, якая ствараецца выкладчыкам. Яна ўключае складанае тэарэтычнае ці практычнае пытанне, якое патрабуе вывучэння, рашэння, даследавання з улікам акрэсленых абставін, што ствараюць тую ці іншую сітуацыю. Праблемная сітуацыя, як вядома, мае два бакі: прадметна-змястоўны, звязаны з вычляненнем супярэчнасці, апорных ведаў, нястачай істотнай інфармацыі, і матывацыйны, накіраваны на пазнанне супярэчнасці і абуджэнне жадання яе ліквідаваць пры ўмове набыцця студэнтамі дадатковых ведаў. Выкладанне з улікам праблемнага навучання ўрэшце рэшт залежыць ад выкладчыкаў, і ў гэтым кірунку ўжо шмат чаго зроблена.

Другім напрамкам удасканалення падрыхтоўкі бібліятэкараў-бібліёграфаў з'яўляецца перагляд зместу навучання. Пры яго вызначэнні, як вядома, трэба ўлічваць прынцып дыялектычнага адзінства двух пачаткаў:



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

нацыянальнага і агульначалавечага, які дазваляе будучаму спецыялісту бібліятэчна-бібліяграфічнай справы, „ганарыцца прыналежнасцю да роднага народа і ў той час усвядоміць сябе грамадзянінам краіны і прадстаўніком усяго роду чалавечага” [1]. Доўгі час у тыпавых планах навучання па спецыяльнасці „Бібліятэказнаўства і бібліяграфія” галоўная ўвага адводзілася вывучэнню дысцыплін, звязаных з раскрыццём савецкіх ведаў і вопыту, ды і тыя разумеліся галоўным чынам як вывучэнне рускага ці руска-савецкага. Аб гэтым сведчаць праграмы, вучэбныя дапаможнікі, створаныя ў тыя часы, а таксама тое, што толькі ў 1976 г. у тыпавым вучэбным плане ўпершыню была прадугледжана пазіцыя „Дысцыпліны, уводзімыя з улікам асаблівасцей саюзнай рэспублікі”. На вывучэнне гэтых дысцыплін адводзілася 160 гадзін (4 % ад усёй колькасці гадзін), і ў далейшым гэта колькасць гадзін не павялічвалася, а,наадварот, змяншалася.

Не лепшае становішча склалася і з вывучэннем замежных вопыту і ведаў. На іх выкладанне адводзілася прыкладна 10 % усёй колькасці гадзін. Такі змест навучання на бібліятэчным факультэце прыводзіў да таго, што выпускнікі недастаткова вывучалі замежны вопыт і веды ў галіне кніжнай і бібліятэчнай справы, бібліяграфіі, літаратуры і мастацтва, і нацыянальную гісторыю, літаратуру, культуру ў цэлым Рэспублікі Беларусь, а таксама другіх суседніх народаў. Каб выправіць гэтыя хібы ў падрыхтоўцы бібліятэкараў, у змест іх навучання былі ўведзены беларусазнаўчыя дысцыпліны, а таксама значна пашырана ва ўсіх агульнанавуковых і спецыяльных курсах вывучэнне беларускай культуры і замежных ведаў і вопыту. Але простае павелічэнне колькасці дысцыплін не ва ўсіх выпадках правамерна, таму што гэта вядзе да шматпрадметнасці, а галоўнае – не дае студэнтам цэльнага ўяўлення аб чалавечай культуры. Таму больш верагодна ўводзіць інтэграваныя курсы, якія будуць адлюстроўваць агульныя заканамернасці развіцця той ці іншай з'явы ў свеце і спецыфіку яе праяўлення ў канкрэтнай краіне: „Усеагульная гісторыя кнігі і кнігазнаўства”, „Усеагульная гісторыя бібліятэчнай справы”, „Усеагульная гісторыя бібліяграфіі” і г.д. Такія курсы патрэбны і па некаторых агульнанавуковых дысцыплінах. Першай спробай у гэтым кірунку з'яўляецца ўвядзенне ў вучэбны план на факультэце „Бібліятэказнаўства і бібліяграфія” ў 1988 г. курса „Міравая літаратура” (зараз у ім патрэбна значна пашырыць вывучэнне беларускай літаратуры).

Гаворачы аб змесце навучання на факультэце бібліятэказнаўства і бібліяграфіі, патрэбна прызнаць, што ён у значнай ступені быў ідэалагізаваны: на вывучэнне грамадскіх дысцыплін адводзілася амаль чацвёртая частка гадзін усяго аб'ёму вучэбнага плана. Цяпер становішча паступова мяняецца, але недастаткова хутка. Так, выпускнікі факультэта на дзяржаўных экзаменах па-ранейшаму здаюць экзамен па філасофіі, у склад якога ўваходзяць пытанні і па іншых грамадскіх дысцыплінах. Не адмаўляючы неабходнасць вывучэння студэнтамі бібліятэчнага факультэта філасофіі на працягу навучання, прыярытэт на дзяржаўных экзаменах

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

павінен быць аддадзены мастацкай літаратуры, бо бібліятэкары, асабліва па спецыялізацыі „Масавыя бібліятэкі", у сваёй прафесійнай дзейнасці маюць справу з захаваннем, апрацоўкай і распаўсюджваннем сярод чытачоў менавіта яе.

Вялікае значэнне мае і матэрыяльнае забеспячэнне навучання на факультэце. З-за адсутнасці сродкаў выкладчыкі не маюць магчымасці выкарыстоўваць сучасныя спосабы распаўсюджвання культуры і інфармацыі і не вучаць студэнтаў валодаць імі. У 1991 г. інстытут культуры змог набыць чатыры камп'ютэры, але гэта не можа задаволіць патрэбы навучання студэнтаў на такім узроўні, які быў бы адэкватны сусветным дасягненням у падрыхтоўцы бібліятэчных кадраў.

**Літаратура**

1. *Ягодин Г.* Идти навстречу // Правда. 1989. 15 авг.

**В.М. БІГЕЗА, канд. філал. навук (МІК)**

## ПЫТАННІ ЎДАСКАНАЛЬВАННЯ ПАДРЫХТОЎКІ КАДРАЎ ДЛЯ РАБОТЫ З ЮНЫМІ ЧЫТАЧАМІ

Фарміраванне спецыяліста – працэс шматгранны. Адна з яго састаўляючых – прафесійная арыентацыя моладзі і адбор у інстытут маладых людзей, якія добра ўяўляюць змест сваёй будучай прафесіі. Гэты працэс вельмі важны, бо, як вядома, ад правільнага выбару прафесіі залежыць не толькі лёс асобы, але і дабрабыт грамадства ў цэлым, яго эканамічная і маральная стабільнасць, жыццяздольнасць.

У інстытуце штогод праводзіцца дзень адчыненых дзвярэй, у які выкладчыкі знаёмяць прысутных з характарам прафесіі бібліятэчнага работніка. З мэтай удасканальвання прафарыентацыйнай работы арганізуюцца выезды выкладчыкаў у школы розных гарадоў і сельскай мясцовасці рэспублікі. Станоўчага эфекту можна дабіцца, устанавіўшы цесныя сувязі з вучэбна-вытворчымі камбінатамі, створанымі пры школах (напрыклад, у г. Лідзе), а таксама непасрэдна з бібліятэкамі, што абслугоўваюць падлеткаў.

У цяперашні час падрыхтоўка будучых кіраўнікоў дзіцячага чытання ажыццяўляецца комплексна, роўнае значэнне прыдаецца як грамадска-палітычным, так і агульнанавуковым і спецыяльным дысцыплінам, а таксама вучэбна-вытворчай практыцы, самастойнай працы студэнтаў. Аднак гэты комплекс дысцыплін мае некаторыя недахопы. На наш погляд, гэта выяўляецца ў недастатковай псіхолага-педагагічнай падрыхтоўцы будучых спецыялістаў, веды якіх атрыманы ў асноўным на агульных курсах педагогікі і псіхалогіі. Сучасны кіраўнік дзіцячым чытаннем павінен валодаць тэорыяй і практыкай выхавання, навучання і адукацыі падрастаючага

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ